Дадатак
да загаду галоўнага
ўпраўлення па адукацыі
Брэсцкага аблвыканкама
ад 17.01 2025 № 45

**УМОВЫ**
**правядзення рэспубліканскага конкурсу**
**юных экскурсаводаў музеяў устаноў адукацыі ва установах адукацыі**
**Брэсцкай вобласці**

**1. Агульныя палажэнні**

1.1. Умовы правядзення рэспубліканскага конкурсу юных экскурсаводаў музеяў устаноў адукацыі (далей – конкурс) распрацаваны ў адпаведнасці з Інструкцыяй аб парадку правядзення рэспубліканскіх мерапрыемстваў установамі дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі з удзелам навучэнцаў, зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 6 ліпеня 2011 г. №59.

1.2. Арганізатарам правядзення конкурсу з'яўляецца Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Арганізацыйнае і метадычнае забеспячэнне ажыццяўляе Установа адукацыі «Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства» (далей – Рэспубліканскі цэнтр).

1.3. Конкурс праводзіцца ў чатыры этапы з вызначэннем пераможцаў і прызёраў:

першы этап (адборачны) – ва ўстановах адукацыі, у тым ліку ва ўстановах адукацыі абласнога, Мінскага гарадскога падпарадкавання;

другі этап (адборачны) – раённы, у тым ліку для гарадоў, якія маюць раённае дзяленне, гарадскі (акрамя г. Мінска);

трэці этап (адборачны) – абласны, Мінскі гарадскі. На дадзеным этапе могуць прымаць удзел установы адукацыі абласнога і Мінскага гарадскога падпарадкавання;

чацвёрты (заключны) – рэспубліканскі.

1.4. Для правядзення конкурсу на кожным этапе ствараюцца арганізацыйныя камітэты (далей – аргкамітэты).

Аргкамітэт кожнага этапу:

забяспечвае арганізацыйнае і метадычнае суправаджэнне конкурсу;

даводзіць інфармацыю аб конкурсе да ведама ўстаноў адукацыі;

вызначае месца і канкрэтныя даты правядзення адпаведнага этапу конкурсу;

ажыццяўляе персанальны падбор складу журы конкурсу і зацвярджае яго ва ўстаноўленым парадку;

аналізуе і абагульняе вынікі конкурсу;

асвятляе ход падрыхтоўкі, правядзення і вынікі конкурсу ў сродках масавай інфармацыі.

У склад аргкамітэтаў могуць уваходзіць прадстаўнікі зацікаўленых дзяржаўных органаў і арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў, устаноў адукацыі, сродкаў масавай інфармацыі, прадстаўнікі органаў самаўпраўлення ўстаноў адукацыі і інш.

1.5. Для падвядзення вынікаў конкурсу на кожным этапе аргкамітэтам ствараецца журы, якое:

праводзіць ацэнку конкурсных работ;

вызначае пераможцаў і прызёраў адпаведных этапаў конкурсу;

прадстаўляе пратаколы па выніках конкурсу ў адпаведныя аргкамітэты.

1.6. Удзельнікамі конкурсу з'яўляюцца асобныя навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ва ўзроставай катэгорыі 13 – 18 гадоў.

**2. Асаблівасці правядзення конкурсу**

2.1. Конкурс праводзіцца з студзеня па сакавік 2025 года.

2.2. Асноўныя мэта і задачы конкурсу

Конкурс праводзіцца з мэтай фарміравання ў дзяцей і навучэнскай моладзі грамадзянска-патрыятычных пачуццяў сродкамі экскурсійнай музейнай дзейнасці.

Асноўнымі задачамі конкурсу з'яўляюцца:

фарміраванне ў дзяцей і моладзі каштоўнасных арыенціраў, гонару і павагі да гісторыі і культуры малой радзімы;

папулярызацыя гісторыка-культурных і прыродных адметнасцей малой радзімы сродкамі экскурсійнай дзейнасці;

папулярызацыя дзейнасці музеяў устаноў адукацыі;

выяўленне і заахвочванне лепшых юных экскурсаводаў музеяў устаноў адукацыі;

развіццё творчых здольнасцей, садзейнічанне прафесійнаму самавызначэннню навучэнцаў, набыццё камунікатыўных навыкаў праз экскурсійную дзейнасць.

2.3. У конкурсе ўдзельнічаюць юныя экскурсаводы музеяў устаноў адукацыі (індывідуальна).

2.4. На конкурс прадстаўляецца прэзентацыя экскурсіі 1 юным экскурсаводам па музею ўстановы адукацыі (патрабаванні размешчаны ў п. 2.5 і п.2.6.). На раенным/гарадкскім этапе адбіраюцца 1 пераможца ад кожнага профілю музея: гістарычны (ваенна-гістарычны, агульнагістарычны, этнаграфічны, гістарычны манаграфічны), літаратурны, краязнаўчы, прыродазнаўчы, мастацкі (па аднаму ў кожным профілі, не больш 8 юных экскурсаводаў). Фармат правядзення першага

і другога этапу вызначаецца арганізатарамі правядзення конкурсу адвольна. Правядзенне раённых (гарадскіх) этапаў конкурсу абавязкова для усіх рэгіенаў вобласці. Рэкамендуецца праводзіць этапы ў вочным фармаце.

2.5. На абласны этап конкурсу рэгіён прадстаўляе відэа прэзентацыі аглядных экскурсій юных экскурсаводаў, пераможцаў раённых/гарадскіх этапаў (да 7-мі хвілін) (па 1 прэзентацыі ад кожнага профілю, не больш за 8 удзельнікаў). Установы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі могуць даслаць відэаэкскурсію на музеі асобна.

Па выніках адбору відэапрэзентацый абласны аргкамітэт пакідае за сабой права арганізацыі праслухоўвання творчага прадстаўлення (экскурсіі) юнага экскурсаода у вочным фармаце.

Заўвага! Экскурсія, дасланая на конкурс з прэзентацыяй 1 музея некалькімі экскурсаводамі, або з перавышэннем 7 хвілін далей не разглядаецца.

Пераможцы абласнога этапу (па аднаму ў кожным профілі, не больш 8 юных экскурсаводаў) удзельнічаюць у рэспубліканскім (заключным) этапе.

2.6. Рэспубліканскі (заключны) этап складаецца з двух тураў.

У першым туры ўдзельнікі конкурсу прадстаўляюць тэматычную экскурсію «Музей у чамадане» (да 5-ці хвілін). Тэма экскурсіі вызначаецца журы і агучваецца непасрэдна пры правядзенні першага тура ў анлайн фармаце. Тры назвы тэм экскурсіі папярэдне дасылаюцца ў рэспубліканскі аргкамітэт. Экскурсія прадстаўляцца па адной тэме выбранай журы конкурсу.

У другім туры (вочным) удзельнікі конкурсу прадстаўляюць аглядную экскурсію адпаведна профілю музея (да 7-мі хвілін). Юныя экскурсаводы ў форме рэкламы знаёмяць з музеем, установы адукацыі, з яго адметнасцямі і ўнікальнасцю. Колькасць аб'ектаў падчас правядзення экскурсіі не абмяжоўваецца. Пры правядзенні экскурсіі могуць выкарыстоўвацца розныя мастацкія сродкі эмацыйнага ўздзеяння (касцюмы, музычнае суправаджэнне і інш.).

2.7. Асноўныя крытэрыі ацэнкі экскурсійнага прадстаўлення:

адпаведнасць агляднай (ці тэматычнай) экскурсіі;

змястоўнасць, інфарматыўнасць;

лагічнасць пераходаў для аб'яднання матэрыялу экскурсіі ў адзінае цэлае;

прыцягненне ўвагі да музея, наяўнасць у экскурсіі элементаў рэкламы;

спалучэнне паказа і расказа;

культура мовы;

займальнасць, крэатыўнасць, артыстызм;

прытрымліванне хранаметражу.

**3.** Пратаколы пасяджэння журы з указаннем колькаснага аналізу ўдзельнікаў рэгіянальных этапаў конкурсу і спасылкамі на відэапрэзентацыю дасылаюцца на абласны этап **не пазней 15 лютага 2025 г.** на e-mail: kraevedbrest@brest.by цэнтралізавана упраўленнямі, аддзеламі па адукацыі гаррайвыканкамаў, адміністрацыямі раёнаў г. Брэста; індывідуальна – установамі адукацыі абласнога падпарадкавання, установамі, якія забяспечваюць рэалізацыю адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

**4.** Відэапрэзентацыі работ пераможцаў ад кожнага профілю прадастаўляюцца на конкурс у выглядзе файлаў, размешчаных на воблачным захаванні. З гэтай мэтай каардынатары раённых/гарадскіх этапаў пазначаюць спасылкі на воблачнае размяшчэнне работ у выпісцы (пратаколе) з рашэння рэгіянальнага этапу (інфармацыя павінна уключаць назву намінацыі і ўстановы адукацыі, поўнае прозвішча і імя удзельнікаў; прозвішча, імя і імя па бацьку кіраўнікоў праекта, кантактны тэлефон з прэфіксам). Пратакол/выпіска са спасылкамі на работы высылаецца ў фармаце Word.

**5. Падвядзенне вынікаў конкурсу**

Пераможцы і прызёры конкурсу вызначаюцца па суме балаў першага і другога тураў.

Пераможцы і прызёры абласнога этапу конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі галоўнага ўпраўлення па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама.

Пры падвядзенні вынікаў конкурсу пры роўнай колькасці балаў на падставе рашэння журы можа ўсталёўвацца адпаведная колькасць прызавых месцаў (першае, другое, трэцяе).

Пераможцы і прызёры заключнага этапу конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі I, II, III ступені Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, дыпломамі Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства.

**6. Фінансаванне конкурсу**

Фінансаванне конкурсу ажыццяўляецца:

на першым, другім, трэцім этапах – ва ўстаноўленым парадку за кошт сродкаў мясцовага бюджэту, якія выдзяляюцца на цэнтралізаваныя мерапрыемствы ў галіне адукацыі, і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам;

на чацвёртым (заключным) этапе – ва ўстаноўленым парадку за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, якія выдзяляюцца на цэнтралізаваныя мерапрыемствы ў галіне адукацыі, і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.